ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУК “Ашмянская раённая бібліятэка”
Н. В. Садоўская
“15” студзеня 2026 г.

# ПАЛАЖЭННЕ
**аб правядзенні раённага бібліятэчнага марафону-конкурсу “Жаночы твар Беларусі: гісторыя, культура, духоўнасць” (у рамках 2026 Года беларускай жанчыны)**

## I. Агульныя палажэнні

1.1. Палажэнне вызначае мэты, задачы, парадак правядзення раённага бібліятэчнага марафону-конкурсу (у далейшым Бібліямарафону).

1.2. Арганізатарам Бібліямарафону з’яўляецца ДУК “Ашмянская раённая бібліятэка” сектара культуры Ашмянскага райвыканкама.

1.3. Адказныя за распрацоўку Палажэння і правядзенне Бібліямарафону – супрацоўнікі сектара маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы ДУК “Ашмянская раённая бібліятэка”.

1.4. Месца правядзення – бібліятэкі ДУК “Ашмянская раёная бібліятэка”.

## II. Мэты і задачы бібліятэчнага марафону-конкурсу

2.1. Раскрыць вобраз беларускай жанчыны праз масавыя мерапрыемствы, паказаць яе ролю і значнасць у гісторыі нашай краіны і ў дзень сённяшні.

2.2. Адкрыццё новых старонак і фактаў з жыцця і дзейнасці знакамітых жанчын Беларусі і свайго краю.

2.3. Данесці да карыстальнікаў максімум інфармацыі аб дасягненнях жанчын у розных сферах дзейнасці, аб яе месцы і ролі ў сям’і і грамадстве, аб ваенным і працоўным подзвігу ў гады Вялікай Айчыннай вайны з выкарыстаннем розных форм масавай работы.

2.4. Папулярызацыя літаратуры, прысвечанай жанчыне – працаўніцы, маці, змагару за свабоду і незалежнасць Радзімы.

## III. Арганізацыя і ўмовы правядзення бібліятэчнага марафону-конкурсу

3.1. Кожная бібліятэка (структурныя падраздзяленні ДУК “Ашмянская раённая бібліятэка”) абавязкова прымае ўдзел у Бібліямарафоне.

3.2. Тэрміны правядзення: люты – лістапад 2026 года.

3.3. Мерапрыемствы з’яўляюцца паказальнымі і праводзяцца згодна зацверджанага графіка.
3.4. Ацэнку мерапрыемству дае Савет пры дырэктары ДУК “Ашмянская раённая бібліятэка”, члены якога будуць прысутнічаць на ўсіх паказальных мерапрыемствах.
3.5. Мерапрыемства павінна мець наступныя матэрыялы: сцэнарый, афішу, спісы ўдзельнікаў і запрошаных, фотаматэрыялы.

## IV. Крытэрыі ацэнкі

4.1. Змястоўнасць сцэнарыя, паўната раскрыцця тэмы мерапрыемства, неардынарнасць формаў падачы інфармацыі.
4.2. Супрацоўніцтва з грамадскасцю, зацікаўленымі ўстановамі і арганізацыямі (краязнаўцы, літаратары, школы, клубныя ўстановы, ДШМ і г.д.).
4.3. Падрыхтоўка кніжных выстаў, інсталяцый, нестандартнае рашэнне афармлення сцэны, залы, дзе праходзіць марапрыемства.
4.4. Рэклама мерапрыемства (запрашальныя квіткі, анонсы, буклеты, аб’явы).
4.5. Выкарыстанне сучасных тэхналогій, інавацыйных формаў і метадаў арганізацыі масавага мерапрыемства (электронныя прэзентацыі, буктрэйлеры, відэаролікі і г.д.).

## V. Падвядзенне вынікаў бібліятэчнага марафону-конкурсу

5.1. Матэрыялы мерапрыемства (сцэнарыі, запрашэнні, афішы, творчыя напрацоўкі, фотаздымкі і інш.), якое праводзіцца ў рамках Бібліямарафону, неабходна прадаставіць у сектар маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы раённай бібліятэкі на папяровым і электронным носьбітах, можна па электроннай пошце да 01.12.2026 г.
5.2. Лепшыя працы будуць прынятыя на разгледжанне пры падвядзенні вынікаў конкурсу на Савеце пры дырэктары.
5.3. Бібліятэкі, якія арганізавалі найбольш крэатыўныя, неардынарныя мерапрыемствы ў рамках конкурсу, будуць адзначаны дыпломамі марафону-конкурсу.

Палубінская В.А.
21409

Дадатак 1.

# Графік правядзення
# раённага бібліятэчнага марафону-конкурсу
# “Жаночы твар Беларусі: гісторыя, культура, духоўнасць”
# (люты–лістапад 2026 г.)

| | Назва і форма мерапрыемства | Тэрмін выканання | Адказны |
|---|---|---|---|
| 1. | Вусны часопіс “Жанчына ў гісторыі Беларусі” | 27 лютага | Філіял “Сельская бібліятэка аг. Баруны” |
| 2. | Літаратурна-музычная кампазіцыя “У свеце няма прыгажэй слова Мама” | 5 сакавіка | Філіял “СБ в. Будзёнаўка” |
| 3. | Час духоўнасці «Женщина – родник духовной мудрости» | 13 сакавіка | Філіял “СБ аг. Гальшаны” |
| 4. | Літаратурна-музычная кампазіцыя «Бабушка – хранительница детства» | 11 сакавіка | Філіял “СБ аг. Кракоўка” |
| 5. | Тэматычны вечар “Жанчына пакарае нябесныя і спартыўныя вышыні” | 9 красавіка | Філіял “СБ в. Гродзі” |
| 6. | Вечар мужнасці і славы “Жанчына ішла па вайне” | 8 мая | Філіял “СБ аг. Граўжышкі” |
| 7. | Патрыятычны ўрок “Мадоны вайны” | 14 мая | Філіял “СБ аг. Станцыя Ашмяны” |
| 8. | Літаратурна-краязнаўчы вечар «В судьбе малой родины – женщины судьба» | 18 чэрвеня | Філіял “СБ аг. Жупраны” |
| 9. | Літаратурна-музычная кампазіцыя «Слава тебе, женщина – труженица, мать» | 9 ліпеня | Філіял “СБ аг. Крэйванцы” |
| 10. | Галерэя творчых асоб “Жанчыны – дзеячы літаратуры і мастацтва” | 17 верасня | Філіял “СБ аг. Мураваная Ашмянка” |
| 11. | Гістарычны экскурс “Гісторыя праз асобу жанчыны” | 15 кастрычніка | Філіял “СБ аг. Навасёлкі” |
| 12. | Вусны часопіс “Гераіні вайны” | 12 лістапада | Філіял “СБ аг. Кальчуны” |
| 13. | Тэматычны вечар “Жанчыны сучаснай Беларусі” | 19 лістапада | Ашмянская раённая бібліятэка |

Загадчык СМСДіМР Палубінская В. А .